Нафтавыя рэкі, бензінавыя берагі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паводле слоў Прэзідэнта, усё, пра што ўрад і кіраўнікі НПЗ, назначаныя якраз два гады назад, прасілі ў яго для завяршэння мадэрнізацыі, было падтрымана на 100 %. Безумоўна, гэта сведчыць пра важнасць той работы, якая праводзіцца.

«Я не скажу, што суверэнітэт і незалежнасць нашай дзяржавы наўпрост і толькі залежаць ад работы НПЗ, але гэта адзін з фактараў, даволі сур'ёзных фактараў існавання эканомікі нашай дзяржавы. Чытай: беларускай дзяржавы ў цэлым. Няма эканомікі — няма дзяржавы», — падкрэсліў беларускі лідар.

Якасць ёсць, а прадаваць не ўмеем

На нарадзе кіраўнік дзяржавы заклікаў агучыць выразныя і аб'ектыўныя даклады па сутнасці па наступных пытаннях. Па-першае, на якой стадыі знаходзіцца рэалізацыя інвестыцыйных праектаў. Па-другое, Прэзідэнтам устаноўлены тэрмін завяршэння будаўніча-мантажных работ — як гэтыя тэрміны вытрымліваюцца на двух заводах. Па-трэцяе, якія вынікі работ НПЗ чакаюцца пасля завяршэння іх мадэрнізацыі. Па-чацвёртае, як плануецца забяспечваць эфектыўную работу ў новых умовах. «Якія перспектывы ў сферы нашай нафтаперапрацоўкі ўрад бачыць хоць на бліжэйшыя 10 гадоў?» — запытаўся кіраўнік дзяржавы.

Сапраўды, на нарадзе Аляксандр Лукашэнка паставіў перад прысутнымі фундаментальныя пытанні па тэме.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы прапанаваў асобна абмеркаваць аспекты павышэння эфектыўнасці экспартных продажаў нафтапрадуктаў. Паводле слоў беларускага лідара, прэтэнзій да якасці няма, людзі задаволеныя, гэта ён ведае ад саміх кіроўцаў і ў Расіі, і ва Украіне, куды пастаўляецца беларускі тавар.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: прадукт мы робім якасны, але, як заўсёды, кульгаюць продажы. Аляксандр Лукашэнка заклікаў навучыцца гандляваць сваім прадуктам, біцца за рынкі і ўтрымліваць іх. Такая бяда датычыцца не толькі нафтапрадуктаў, але і іншых тавараў, якія вырабляюць у Беларусі. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы даручыў наступнае: перш за ўсё віцэ-прэм'еры адказваюць за цэнаўтварэнне на знешніх рынках і эфектыўнасць продажаў.

Ён дадаў, што ў гэтых пытаннях важная сутнасць. «Сутнасць, якая ў дадзеным выпадку мяне датычыцца, ды і ўрада, — гэта заканчэнне мадэрнізацыі», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка спецыяльна патлумачыў яе сэнс: цяпер мы на НПЗ маем ледзь не 20 % мазуту пры перапрацоўцы нафты, так што была пастаўлена задача, каб гэтых адходаў было як найменш. Калі мадэрнізацыя будзе завершана — будзе 3-4 працэнты такіх рэшткаў.

Мадэрнізацыю скончаць — а ў будучым годзе ўжо трэба задзейнічаць усе аб'екты. Беларускі лідар нагадаў, што тэрміны сціслыя — але нікуды не дзенешся. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў 40-я гады XX стагоддзя працаўнікам НПЗ было значна складаней, трэба было перакідваць абсталяванне заводаў на Урал, усталяваць яго і даць прадукт.

«А сёння мы разбоўталіся. Шмат размаўляем і ўсё плачам, што ў нас то спецыялістаў няма, то яшчэ чаго няма. Няма спецыялістаў — рыхтуйце, шукайце, у свеце іх хапае», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Трымаць адказ перад народам

Вынікі нарады беларускі лідар агучыў у размове з радавымі супрацоўнікамі «Нафтана»:

«Хачу сказаць, што вырашаліся праблемы не толькі вашыя, але і пытанні сур'ёзныя, палітычныя. Вы разумееце, што два нафтаперапрацоўчыя заводы і «Беларуснафта» як кампанія, якая здабывае перш за ўсё нафту ў Беларусі і за мяжой, — гэта аснова нашай эканомікі. І ад таго, будуць працаваць гэтыя прадпрыемствы ці не, залежыць у будучыні жыццё многіх беларусаў, таму што сёння без паліва нікуды», — канстатаваў ён і дадаў, што альтэрнатыўныя крыніцы дакладна не стануць асноўным відам паліва яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў.

Беларускі лідар назваў забеспячэнне краіны палівам адным з найважнейшых фактараў нашай незалежнасці. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Расія сваім падатковым манеўрам і іншымі дзеяннямі паставіла беларускія прадпрыемствы ў вельмі сур'ёзную сітуацыю. Пры гэтым рынак застаецца нестабільным, цэны скачуць, а ёсць яшчэ і гандлёвыя войны...

І тут, упэўнены Аляксандр Лукашэнка, трэба вызначыцца, як жыць далей. Праблем нямала, адна з асноўных — далейшае функцыянаванне нашых НПЗ: што будзем рабіць?

Прэзідэнт звярнуў увагу, што ў Беларусі і да падатковага манеўру Расіі задумаліся, як арыентаваць працу НПЗ. Тады пачалася мадэрнізацыя абодвух прадпрыемстваў — і сёння яна знаходзіцца на завяршальнай стадыі.

Наваполацкі нафтаперапрацоўчы завод закончыць будаўніча-мантажныя работы сёлета, праектныя выпрабаванні пачнуцца ў канцы 2019 — пачатку 2020 года. У Мазыры завяршэнне мадэрнізацыі запланавана на сярэдзіну будучага года (будмантаж пяці аб'ектаў, якія на працягу наступнага года выйдуць на праектную магутнасць).

Таксама на нарадзе абмеркавалі перспектывы. Вызначыліся, што Мазырскі завод — гэта паліўны кірунак, плануецца атрыманне светлых нафтапрадуктаў. У Наваполацку будуць вырабляць паліва, а таксама арыентавацца на далейшае развіццё выпуску запатрабаванай нафтахімічнай прадукцыі.

Не забыцца пра чалавека

Расказаў беларускі лідар і пра планы на будучыню: так, па завяршэнні мадэрнізацыі плануецца выпрацаваць агульную лінію паводзін: як мадэрнізавацца, развівацца і паглыбляцца (гэта будзе зроблена падчас будучага візіту на Мазырскі НПЗ). У будучыні мадэрнізацыя можа закрануць і іншыя прадпрыемствы нафтахімічнай галіны, аднак у грашовым эквіваленце гэта будуць значна меншыя ўліванні. Усё гэта трэба для вытворчасці патрэбнай для рынку прадукцыі, дадаў ён.

Апошнім пытаннем на нарадзе бакі абмеркавалі продажы. Аляксандр Лукашэнка пахваліў нашы НПЗ за вытворчасць якаснага прадукту, на які ёсць попыт. «Але прадаваць не ўмеем. Ці, скажам так, недастаткова добра гандлюем гэтым таварам», — сказаў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што беларусы — не гандляры, вырабіць вырабім, а ад продажу атрымаць большы даход не ўмеем — пакуль не ўмеем. Трэба вучыцца.

Таксама Аляксандр Лукашэнка заклікаў захаваць сацыяльны пакет прадпрыемства «Нафтан». Гэта і піянерскія лагеры, і бальніцы, і санаторыі, і інтэрнаты. Паводле яго слоў, для завода гэта невялікая нагрузка, а для людзей гэта вельмі важна. Прэзідэнт падкрэсліў: трэба ўсяляк працаваць на тое, каб утрымаць людзей.

Яшчэ Аляксандр Лукашэнка расказаў, што па-ранейшаму прытрымліваецца пазіцыі: стратэгічныя (ды і іншыя) прадпрыемствы мы прадаваць не будзем. Ён успомніў, як у пачатку яго прэзідэнцтва за 15 мільёнаў долараў прадалі кантрольны пакет Мазырскага НПЗ. «Я сказаў: за суткі вярніце таму, хто гэтыя 15 мільёнаў нам паралічыў», — паведаміў беларускі лідар і дадаў, што разгляд прапаноў па продажы магчымы, але толькі касмічнага маштабу. Аднак вырашаць гэта павінны ў першую чаргу працоўныя калектывы і мясцовыя ўлады.

Прэзідэнта не адпусцілі з пустымі рукамі: у падарунак ад супрацоўнікаў завода Аляксандр Лукашэнка атрымаў карціну, на якой адлюстраваная ўстаноўка першаснай перапрацоўкі нафты АТ-8.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

Балы ў абітурыентаў могуць вырасці

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ігар Петрышэнка звярнуў увагу на тую акалічнасць, што кожны год паўтараюцца спробы абітурыентаў скарыстацца падчас уступных іспытаў мабільным тэлефонам або іншымі тэхнічнымі прыладамі. «Праз камісіі на месцах, з дапамогай сродкаў масавай інфармацыі неабходна яшчэ раз давесці, што любыя падобныя дзеянні будуць спыняцца і абітурыент будзе адхілены ад удзелу ў тэсціраванні. Пра гэта абавязкова трэба нагадваць і папярэджваць падчас пропуску ў экзаменацыйныя аўдыторыі» , — дадаў ён.

Старшыня дзяржкамісіі звярнуў увагу на неабходнасць адсочваць з'яўленне непраўдзівай інфармацыі аб даступнасці і продажы адказаў на тэставыя заданні. З такімі інсінуацыямі павінны неадкладна разбірацца як члены дзяржкамісіі, так і праваахоўныя органы.

Асаблівая ўвага будзе нададзена зваротам абітурыентаў і іх бацькоў, каб захаваць прынцып справядлівасці для кожнага, адзначыў віцэ-прэм'ер. Пасля 1 чэрвеня ў дзяржкамісію ўжо паступілі тры звароты ад тых, хто па розных прычынах не паспеў зарэгістравацца на ЦТ. Напрыклад, адзін абітурыент звярнуўся ў пункт рэгістрацыі, але тэхнічна не паспеў правесці плацеж, бо гэта былі выхадныя дні. Мы пайшлі яму насустрач і прынялі станоўчае рашэнне, таму што сам факт рэгістрацыі на ЦТ адбыўся ў вызначаныя тэрміны», — праінфармаваў Ігар Петрышэнка.

Міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА спыніўся на навацыях сёлетняй уступнай кампаніі. Сярод іх — прыём на бюджэтную форму навучання ў беларускія ВНУ замежных грамадзян, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі іншых краін. Інфармацыя пра такую магчымасць распаўсюджвалася па каналах дыпламатычнай службы. Галоўная мэта навацыі — прасоўваць эканамічныя інтарэсы Беларусі ў свеце. Для навучання замежных грамадзян за бюджэтныя сродкі быў выдзелены ліміт у 100 грантаў, але сёлета для сумоўя змаглі адабраць толькі 30 кандыдатаў, бо да іх прад'яўляюцца даволі высокія патрабаванні.

Без экзаменаў будуць прымаць сёлета на профільныя спецыяльнасці ў ВНУ пераможцаў рэспубліканскай алімпіяды па фізічнай культуры і здароўі, якая прайшла ў Беларусі ўпершыню. Таксама былі ўстаноўлены адзіныя ўступныя іспыты пры паступленні на скарочаную форму навучання ў розныя ВНУ на адну і тую ж спецыяльнасць.

У 2019 годзе падчас правядзення цэнтралізаванага тэсціравання будзе выкарыстоўвацца новая методыка разліку тэставых балаў, якая дазваляе не толькі ранжыраваць абітурыентаў па ўзроўні іх падрыхтоўкі, але і супастаўляць вынікі здачы ЦТ з вынікамі навучання ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

«Раней, калі абітурыент меў «васьмёрку» па матэматыцы ў школе, а на тэсце атрымліваў 45 балаў, усе задаваліся пытаннем: «Ён здаў матэматыку на 4,5 бала?» Але гэта быў рэйтынг, — патлумачыў Ігар Карпенка. — А зараз балы будуць больш-менш набліжаны да школьнай адзнакі, і мы тады зможам зразумець, наколькі настаўнік якасна працаваў, а бацькі абітурыента ўбачаць больш-менш прымальныя і зразумелыя ім лічбы. Раней рэпетытары «муштравалі» абітурыентаў на выкананне заданняў пятага і чацвёртага ўзроўняў складанасці, з якімі спраўляліся нямногія, таму за іх налічваліся самыя высокія балы. А цяпер і сераднячкі змаглі «падцягнуцца».

Мяркуецца, што ў параўнанні з папярэднім годам балы абітурыентаў падніміцца ў сярэднім на 20 пунктаў. Такую лічбу агучыў дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый Міксюк, адказваючы на пытанне.

З 1 чэрвеня ў Міністэрстве адукацыі пачала працаваць гарачая лінія для абітурыентаў (017) 222 43 13. Гарачыя тэлефонныя лініі дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам уступных выпрабаванняў створаны для абітурыентаў на базе цэнтральнага апарата Камітэта дзяржаўнага кантролю і камітэтаў у абласцях. Нумары тэлефонаў: рабочай групы дзяржкамісіі ў Мінску — (017) 327 66 80; Брэсцкай абласной камісіі — (0162) 21 18 76 і 21 18 94; Віцебскай абласной камісіі — (0212) 37 61 93 і 37 61 82; Гомельскай абласной камісіі — (0232) 23 83 85; Гродзенскай абласной камісіі — (0152) 79 88 01, 79 88 40 і 79 88 16; Мінскай абласной камісіі — (017) 331 66 02 і 284 09 06 і Магілёўскай абласной камісіі — (0222) 22 18 97, 31 07 73 і 31 07 75.

Надзея НІКАЛАЕВА.

MINSK 2019

АБ ГУЛЬНЯХ ДАВЕДАЕЦЦА ЎВЕСЬ СВЕТ

Турнір у Мінску плануюць асвятляць журналісты з 52 краін.

На акрэдытацыю было пададзена больш за 1000 заявак з 52 краін і 379 рэдакцый, якія прадстаўляюць друкаваныя выданні, тэле- і радыёарганізацыі, што не з'яўляюцца праваўладальнікамі. Амаль адну траціну складуць журналісты-жанчыны.

У Мінск прыедуць прадстаўнікі СМІ з усёй Еўропы, а таксама з Аўстраліі, Бангладэш, Бразіліі, Індыі, Манголіі, Пакістана, Паўднёвай Афрыкі, Шры-Ланкі і ЗША. Выдача акрэдытацый прадстаўнікам СМІ пачалася 5 чэрвеня.

Таксама ў Мінску будуць працаваць больш за 1,3 тысячы прадстаўнікоў тэлевізійных кампаній, якія будуць трансляваць спаборніцтвы Еўрапейскіх гульняў больш чым у 120 краінах. Міжнародны вяшчальны цэнтр пачне працаваць 17 чэрвеня. На гэтым тыдні з арганізацыяй важнага для спартыўнага форуму аб'екта ў Футбольным манежы азнаёміўся **прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей РУМАС.**

Нагадаем, дамашнім тэлевяшчальнікам спартыўнага форуму будзе іспанская кампанія ISB, ад якой акрэдытавана каля 200 чалавек. У час наведвання цэнтра Сяргей Румас пагутарыў з выканаўчым дырэктарам кампаніі Урсулай Рамэра. Яна сама рэжысіравала прамыя трансляцыі многіх дысцыплін міжнародных спаборніцтваў, а ў Мінску будзе кантраляваць, каб групы з кожнай пляцоўкі Гульняў забяспечвалі не толькі выразны сігнал, але і высокі ўзровень карцінкі. Урсула Рамэра адзначыла, што задаволена падрыхтоўкай цэнтра з боку Дырэкцыі.

Цэнтр уяўляе сабой комплекс з усім неабходным абсталяваннем, якое забяспечвае кругласутачнае вяшчанне. У яго структуру ўваходзіць некалькі зон: для дамашняга і нацыянальнага вяшчальніка, праваўладальнікаў, галоўны тэлевізійны лагістычны склад (месца для захоўвання здымачнага абсталявання), тэхнічная зона і іншыя. У час Гульняў адсюль будуць каардынавацца дзеянні тэлевізійных брыгад, тэхнічных сродкаў. Дадаткова Цэнтр зможа падаваць відэа для навінавых службаў, пакет праграм для трансляцыі на спартыўныя комплексы. Як растлумачыў менеджар Міжнароднага вяшчальнага цэнтра кіравання неспартыўных аб'ектаў Дырэкцыі Дзмітрый Шыла, асноўнае прызначэнне цэнтра — збор інфармацыі з усіх аб'ектаў, апрацоўка відэасігналу, вынікаў спаборніцтваў, іх адпраўка па чатырох міжнародных тэлевізійных каналах праваўладальнікам.

Цэнтр ужо гатовы да эксплуатацыі, ён будзе адкрыты з 17 чэрвеня з 6.00 да 2.00 наступных сутак.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Навагрудак збірае грошы на помнік Міндоўгу

Кожны беларус мае ўнікальную магчымасць унесці сваю грашовую лепту ў праслаўленне айчыннай гісторыі. Навагрудскі райвыканкам робіць рэальныя крокі на шляху ўстанаўлення ў горадзе помніка Міндоўгу. І толькі нам вырашаць, завісне гэтая справа ў паветры на доўгія гады ці найбліжэйшым часам стане рэальнасцю.

Навагрудак чакае манумент Міндоўгу ўжо гадоў 10. Летась правялі мастацка-экспертныя саветы па гэтым пытанні. Скульптар Сяргей Бандарэнка перамог у суперніцтве за стварэнне доўгачаканага манумента.

Цяпер бачныя вынікі першага этапу працы, які каштаваў 10 тысяч рублёў: эскізны праект помніка, пластылінавая 35-сантыметровая мініяцюра, візуалізацыя праекта на мясцовасці, а таксама падрабязны план размяшчэння будучай скульптуры на плошчы.

Помнік выраша-на ўстанавіць за пазабюджэтныя грошы. 26 тысяч рублёў — менавіта ў столькі ацанілі манумент Міндоўга. На 4 чэрвеня дабрачынны рахунак папоўніўся 4285 рублямі. Гэта 15 % ад патрэбнай сумы.

А па-куль работа замарожана, бо другі этап патрабуе стварэння рабочай мадэлі помніка. Актыўныя будаўнічыя дзеянні і мантаж манумента пачнуцца пасля склікання наступнага Рэспубліканскага мастацка-экспертнага савета.

Нагадаем, легендарны князь — стваральнік адзінай цэнтралізаванай раннефеадальнай дзяржавы (Літвы Міндоўга), вядомы ваенным талентам і ваяўнічым характарам. Яму ж прыпісваюць і пераадоленне разрозненасці сваёй дзяржавы. І менавіта Міндоўгу Навагрудак удзячны за сваё велічнае мінулае. Горад быў першай сталіцай Вялікага Княства Літоўскага, бачыў дзяржаўныя сеймы, пасяджэнні найвышэйшага суда. У 1253 годзе Міндоўга каранавалі ад імя папы рымскага менавіта ў Навагрудку. Як мяркуецца, тут жа кароль і пахаваны.

На працягу апошніх 30 гадоў старажытны горад праводзіць фестываль сярэднявечнай культуры. І галоўная плошча Навагрудка — ідэальнае месца для манумента першага караля ВКЛ, які меў тут рэзідэнцыю.

Рэквізіты для ахвяраванняў

Аддзел культуры Навагрудскага райвыканкама.

УНП 500031377 у ЦБП № 416 г. Навагрудак філіял № 413 ААТ «АСБ Беларусбанк», г. Ліда.

БІК AKBBBY21413.

BY72AKBB36425210006224200000 (з пометкай «На стварэнне помніка Міндоўгу»).

Маргарыта САДОЎСКАЯ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «БЕЛПОЧТА»

Наименование и местоположение объекта	Начальная цена продажи, BYN	Сумма задатка, BYN	Общая площадь, кв. м	Коэф. от 0,5 до 3,0
Помещение площадью 9,9 кв. м, расположенное на первом этаже капитального строения с инвентарным номером 100/С-83455, по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Адамковская, д. 58А	41,83	4,18	9,9	3,0
Условия	1. Срок аренды: не менее 3 лет. 2. С победителем аукциона в течение 10 рабочих дней будет заключен договор аренды помещения. 3. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка. 4. Возместить Организатору аукциона расходы по их проведению в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. 5. Для размещения офиса, складского помещения, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств)			
Реквизиты для перечисления задатка	РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал, BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк». Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича, 10 BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245			

Аукцион состоится 9 июля 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, и иную информацию можно узнать у организатора аукциона по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81

Размер штрафных санкций, предусмотренных Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 (в ред. Указов Президента Республики Беларусь от 11.12.2009 г. № 624, от 23.09.2011 г. № 431, от 10.01.2013 г. № 14) составляет 10 базовых величин.

Последний день приема заявлений – 8 июля 2019 г. до 17.00

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ООО «Оксана»

Предмет торгов – капитальное строение с инвентарным номером 100/С-1556 (наименование: здание социально-культурного центра; назначение: здание специализированное иного назначения), площадью 1879 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 121284004601000037, площадью 1,3028 га, по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Городская, 23

Начальная цена, руб. (без учета НДС)	**518 000,00**	**Размер задатка, руб.**	**51 800,00**
Условия продажи	Без условий		
Организатор аукциона	Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»		
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона		
Условия оплаты	В соответствии с заключенным договором купли-продажи		
Номер р/с для перечисления задатка	BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк». Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245		

Аукцион состоится 20 июня 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, а также иную информацию можно узнать у организатора аукциона по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 19 июня 2019 г. до 17.00

*** Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает возмещение затрат Организатору аукциона.**

Ранее извещение о проведении аукциона по продаже имущества ООО «Оксана» опубликовано в газете «Звязда» от 20.04.2019 г.

Извещение о проведении открытого аукциона

Аукцион состоится 08.07.2019 г. в 10.30 по адресу: г. Гродно, ул. Карла Маркса, д. 29, 4-й этаж, актовый зал.

Организатором аукциона является РУП «Белпочта» в лице Гродненского филиала РУП «Белпочта», находящегося по адресу: г. Гродно, ул. Карла Маркса, 29.

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества.

Лот №1. Помещение на 3-м этаже площадью 16,1 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., г. Гродно, ул. Карла Маркса, 29, пом. 6, изолированное помещение, помещение связи, срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи – 68 руб. 02 коп., размер задатка – 6 руб. 80 коп., целевое использование – размещение офисов, под производственные цели (за исключением вредных производств), оказание услуг, осуществление торговли, под складские помещения;

Арендная плата устанавливается в соответствии с Положением о порядке определения размера арендной платы при сдаче в аренду капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 года № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом» (далее – Положение). При установлении коэффициента от 0,5 до 3 включительно, определенного п. 8.2 Положения, при расчете арендной платы применяется коэффициент в размере 3.

Документы на участие в аукционе принимаются с 10.06.2019 г. по 05.07.2019 г. в рабочее время (с 8.30 до 17.15 по адресу: г. Гродно, ул. Карла Маркса, д. 29, 3-й этаж, каб. 302. Документы, поданные после 16.00 05.07.2019 г., не рассматриваются.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным Постановлением Совета Министров от 08.08.2009 г. №1049.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

– перечисляет задаток на р/с BY42AKBB30120000600064000000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21400, УНП 500826554, Гродненский филиал РУП «Белпочта»;

– подает заявление на участие в аукционе;

– заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;

– представляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

– физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;

– индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации, документ, удостоверяющий личность;

– юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов представляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

В случаях, если победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол о результатах аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также, в случае если участники аукциона, отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 20 базовых величин.

Договор аренды по результатам проведения аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

Телефоны для справок: (8-0152) 68-59-96, факс (8-0152) 72-31-23

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Кругогорье-Петковичи» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже:

Лот 1: здание склада общей площадью 342,9 кв.м. с инв. № 620/С-39663, расположенное на земельном участке площадью 0,6151 га с кадастровым номером 622200000001003100 по адресу: Минская область, Дзержинский район, Боровской с/с, 10, около д. Старинки.

Начальная цена с НДС (20 %) – **16 365,22 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – 1 636,00 бел. руб.).

Лот 2: цех по распиловке мрамора общей площадью 136,3 кв. м с инв. № 620/С-37454, расположенный на земельном участке площадью 0,1220 га с кадастровым номером 622250100001005065 по адресу: Минская область, Дзержинский район, г. Дзержинск, ул. Колхозная, 1Г.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 41 489,28 бел. руб.** (задаток 10% от начальной цены – 4 148,00 бел. руб.).

Стоимость лотов снижена на 4 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в следующем размере: по лоту № 1 – 10 (десять) процентов, по лоту № 2 – 5 (пять) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 05.02.2019. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **25.06.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.06.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Несвижский завод медицинских препаратов» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **комплекта оборудования для выдува ПЭТ-бутылок инв. № по бух. учету 050802, в составе:**

– полуавтомат выдува ПЭТ-бутылок СП-8У-16, заводской № 0280309;

– полуавтомат выдува ПЭТ-бутылок СП-8У-16, заводской № 0290309;

– станция разогрева преформ СП-8/2 (ТС), заводской № 0390309;

– пресс формы для выдува бутылок объемом V=0,1 л. (комплект 2 шт.)

Начальная цена с НДС (20 %) – **25,50 бел. руб.** (задаток – **25,50 бел. руб.**).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 17.10.2018, 30.11.2018 и 14.03.2019. Аукцион состоится **19.06.2019** в **15.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.06.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж», сообщает о проведении внеочередного общего собрания акционеров

Собрание состоится 21 июня 2019 года в 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8-А.

Повестка дня:

1. Об утверждении локальных нормативных актов.

Список акционеров для регистрации участников собрания составляется на 10 июня 2019 года.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросу повестки дня собрания в рабочие дни (понедельник – пятница) начиная с 14 июня 2019 года – по месту нахождения общества с 14.00 до 16.00.

Время регистрации участников собрания – в день проведения собрания с 15.30 до 16.00.

Акционерам иметь при себе паспорт, представителям акционеров – паспорт и доверенность.

Справки по телефону: 8 0232 359 102.

УНП 400052115

Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж», расположенное по адресу: 246007, г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8-А, настоящим информирует, что на основании решения наблюдательного совета от 6 июня 2019 года осуществляется формирование реестра акционеров общества по состоянию на 10 июня 2019 года для проведения внеочередного общего собрания акционеров 21 июня 2019 года.

УНП 400052115